Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

# Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю БДПУ імя М. Танка

Мінск, 25 кастрычніка 2002 г.

Выпуск 2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
2002

Г.Ю. Калядзінская, В.І. Талкачоў, М.У. Смяховіч, А.М. Літвін, А.А. Цобкала, Д.В. Дубінін, А.Ф. Рацько, К.І. Козак, якія ўліліся ў рады выкладчыцкага складу кафедры. У 198? г. абараніў доктарскую дысертацыю М.К. Сакалоў.

Пад кіраўніцтвам А.М. Мацко, актыўнай падтрымцы і дапамозе вопытных педагогаў кафедры прафесара А.І. Кавалёва, дацэнтаў В.Р. Аліферавай, А.М. Грыгор'евай, творчая моладзь кафедры падрыхтавала для студэнтаў некалькі дзесяткаў навукова-метадычных дапаможнікаў, планы семінарскіх заняткаў. Свет убачылі першыя кафедральныя зборнікі навуковых прац маладых вучоных, у якіх апрабіравалі свае даследаванні аспіранты кафедры.

Адметныя навуковыя дасягненні членаў калектыву. Прафесар А. М. Мацко з'явіўся аўтарам шэрагу манаграфічных даследаванняў: «Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма» (Мн., 1963), «Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков» (Мн., 1972), сааўтарам кніг «Революционный путь Компартии Западной Белоруссии» (Мн., 1966), «Дорогой борьбы и созидания» (Мн., 1981), «В союзе нерушимом» (Мн., 1982), «Курс лекций по истории КПСС» (Мн., 1970), прафесар І.А. Кавалёў выдаў манаграфію «Идеологическая работа КПБ в период создания фундамента социализма» (Мн., 1970), доцент Л.А. Шульга падрыхтавала манаграфію «Молодые хозяева земли» (Мн., 1976), дацэнт М.К. Сакалоў – «Партийное руководство подготовкой и воспитанием кадров высшей школы БССР» (Мн., 1978); дацэнт С.У. Кабяк – «Под знаменем пролетарской солидарности» (Мн., 1979), дацэнт І.Б. Канапацкі – «По законам братства» (Мн., 1980), В.Ф. Кушнер –

У спаборніцтве за арганізацыю вучэбна-выхаваўчай работы, высокія дасягненні навуковых і навукова-метадычных даследаванняў калектыў кафедры штогод дабіваўся значных вынікаў, неаднаразова прызнаваўся пераможцам сярод кафедр інстытута. Толькі за 1975–1990 гг. калектыву было ўручана 27 ганаровых грамат рэктарата, раённых, абласных і рэспубліканскіх уладных устаноў. За вялікі ўклад у справу падрыхтоўкі педагагічных кадраў, навукова-метадычную работу прафесару А.М. Мацко, дацэнтам Л.А. Шульга, С.У. Кабяку прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік вышэйшай школы», дацэнтам В.Р. Аліферавай, А.М. Грыгор'евай, В.Ф. Касовічу, старэйшаму выкладчыку Я.К. Касцевічу «Выдатнік народнай асветы БССР».

Прызнаннем аўтарытэта выкладчыкаў, іх арганізатарскіх здольнасцей з'яўляецца тое, што многія з іх абіраліся на адказныя пасады ў дзяржаўныя органы, а таксама ўніверсітэта. У.Д. Атрошчанка працаваў сакратаром Мінскага абкама КПБ, Л.А. Шульга, В.Ф. Касовіч, А.К. Лабанок сакратарамі парткама педагагічнага інстытута, В.І. Талкачоў з'яўляўся кіраўніком прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Многія навукоўцы кафедры ўзначальваюць падраздзяленні універсітэта.

Часам своеасаблівага выпрабавання навуковай падрыхтаванасці, узроўню педагагічнага майстэрства і адданасці справе з'явіліся для кафедральнага калектыву 90-я гг. XX ст. Крызіс марксісцка-ленінскай метадалогіі, перамены ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі патрабавалі неадкладнай перабудовы вучэбнага накірунку ў яе дзейнасці. У 1990 г. кафедру ўзначаліў кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.Ф. Касовіч. Толькі дзякуючы яго паслядоўнасці, бачанню перспектывы, безумоўнай падтрымцы былога рэктара, прафесара А.Ц. Караткевіча і рэктара, доктара гістарычных навук, акадэміка МАН Л.Н. Ціханава было паспяхова пераадолены шматлікія творча-пашуковыя праблемы, кафедра змагла захавацца як агульнауніверсітэцкая структурная адзінка. У 1991 г. была ператворана ў кафедру палітычнай гісторыі, а з верасня 1992 г. у кафедру айчыннай і сусветнай гісторыі. З 1990 па 1995 год яе ўзначальваў В.Ф. Касовіч, некаторы час В.І. Талкачоў, а з верасня 1996 г. кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.А. Каваленя. Негледзячы на ўсе складанасці навукова-педагагічнага лёсу кафедры ўдалося не толькі захаваць, але і папоўніць свае рады маладымі, таленавітымі кадрамі.



Пасля заканчэння гістарычнага факультэта ВДПУ і аспірантуры на кафедру асістэнтамі прыйшлі В.В. Даніловіч, М.А. Атрушкевіч, М.Г. Жылінскі. Скончыўшы магістратуру аспірантамі кафедры сталі В.В. Баранава, В.І. Крывуць, А.У. Краўчанка. У 2002 г. паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю А.А. Каваленя.

Нажаль жыццё бярэ сваё. Былыя выкладчыкі кафедры Я.К. Касцевіч, Е.Н. Шкляр, А.М. Грыгор'ева, Е.Б. Фрумкін, Я.С. Мазурава, Я.І. Фёдараў, загадчыца кабінета Г.С. Цітовіч, лабарантка А.І. Марцулева знаходзяцца на заслужаным адпачынку, іншых ужо не стала. Заўчасна памер у 2000 г. кандыдат гістарычных навук, дацэнт, першы прарэктар па вучэбнай рабоце У.Д. Атрошчанка, у 2001 г. на 77 годзе жыцця былы загадчык кафедры А.М. Мацко, нестала прафесара І.А. Кавалёва, дацэнтаў А.Ц. Котава, В.Р. Аліферавай, старэйшага выкладчыка С.П. Маркаўца. Светлая памяць аб гэтых высокародных людзях, якія значна паўплывалі на лёс кафедры назаўсёды застанецца ў памяці калектыва.

Пераадольваючы складанасці 90-х калектыў кафедры з упэўне-насцю глядзіць у будучыню. Сёння на кафедры плённа працуе творчы калектыў у складзе загадчыка кафедры, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Аляксандравіча Кавалені, кандыдаты гістарычных навук, дацэнта: Святлана Іосіфаўна Альшэўская, Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч, Генадзь Васільевіч Жылінскі– намеснік загадчыка па вучэбнай рабоце, Сяргей Дзмітрыевіч Жмуроўскі – намеснік загадчыка па навуковай рабоце, Валерый Фёдаравіч Касовіч, Сяргей Уладзіміравіч Кабяк, Таццяна Юльянаўна Калядзінская, Анатоль Канстанцінавіч Лабанок, Вольга Пятроўна Паўлоўская, Валерый Іванавіч Талкачоў, Людміла Арсенцьеўна Шульга, асістэнт Марат Генадзьевіч Жылінскі, выкладчык-стажор Аляксандр Уладзіміравіч Краўчанка, аспіранты Вольга Валер'еўна Баранава, Віталь Іванавіч Крывуць, лабаранты Вольга Анатольеўна Норык, Ніна Данілаўна Ветрава, Таццяна Ігараўна Салаўёва.

Новыя гістарычныя і палітычныя рэаліі, гуманізацыя вучэбна-выхаваўчага працэса робяць надзённым неабходнасць удасканалення практыкі агульнагістарычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў, лібералізацыі іх поглядаў на сацыяльна-палітычнае развіццё сусветнага грамадства, выпрацоўкі разумення сутнасці і ўзаемасувязі нацыянальна-дзяржаўных і агульначалавечых каштоўнасцяў.

Веданне сусветнай і айчыннай гісторыі дапамагае студэнцкай моладзі пазбавіцца ад ідэі ўсеагульнага фаталізма, убачыць розныя мадэлі самаарганізацыі грамадстваў у мінулым, шматлікія прыклады свабоды і дэмакратыі, а таксама ўзмацняе іх адказнасць перад будучым як рэальную сілу гісторыі.

Асноўнымі прынцыпамі канцэпцыі агульнаадукацыйнага гістарычнага курса «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый», якую забяспечвае кафедра, аб'ектыўнасць збалансаванасць, цывілізацыйны падыход пры асвятленні гістарычнага мінулага беларускага народа з акцэнтамі на лёсавызначальных гістарычных падзеях, разуменні адзінства айчыннай і сусветнай гісторыі.

У адпаведнасці з такім канцэптуальным падыходам і ажыццяўляе сваю дзейнасць кафедра айчыннай і сусветнай гісторыі ВДПУ сення на 15 факультэтах універсітэта. На аснове распрацаванага стандарта і вучэбнай праграмы «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілі-зацый», абапіраючыся на храналагічную перыядызацыю у межах сусветных цывілізацый, ставіцца мэта даць будучым педагогам грунтоўныя веды аб



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах у рамках традыцыйнага, індустрыяльнага і постіндустрыяльнага развіцця чалавечага грамадства; аб цывілізацыйных асаблівасцях, найперш Еўропы; аб гісторыі Беларусі на фоне еўрапейскіх і сусветных падзей мінулага. Прычым, гісторыя XX ст. вылучаецца як асноўны аб'ект навуковага погляду. Метадалагічным стрыжнем новага гістарычнага курса з'яўляецца тое, што вывучэнне вопыту сусветнага і айчыннага грамадства з'яўляецца не проста сумай гістарычных ведаў, а выступае як прапедаўтычная дысцыпліна, якая дапаможа асэнсавана засвойваць не толькі матэрыял грамадска-палітычных курсаў, што асабліва важна, стварыць неабходны навуковы падмурак разумення спецыяльных дысцыплін, закладвае трывалую аснову фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі будучага настаўніка, яго нацыянальна-патрыятычных перакананняў.

Апрача праграмы і асноўнага вучэбнага курса на кафедры распрацаваны і укаранёны ў вучэбны працэс шэраг спецкурсаў. Так, пад кіраўніцтвам А.А. Кавалені падрыхтавана праграма спецкурса «Гісторыя маладзёжнага руху», які чытаецца на прыродазнаўчым, дэфекталагічным, гістарычным факультэтах. На факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання чытаюцца спецкурсы «Мая Радзіма Беларусь» і «Гістарычнае краязнаўства», на музычна-педагагічным «Гісторыка-культурнае краязнаўства», на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў – «Гістарычнае краязнаўства», на гістарычным «Маладзёжны рух у гады Вялікай Айчыннай вайны» і «Палітычныя партыі і рухі Беларусі».

Выкладчыкі кафедры арганізуюць на факультэтах працу праблемных груп па гісторыі, што садзейнічае не толькі паглыбленаму, трываламу і асэнсаванаму засваенню матэрыяла курса, але студэнты робяць першыя крокі ў навуковае жыццё. Кожны год у іх займаецца звыш 150 найбольш падрыхтаваных студэнтаў, якія рыхтуюць змястоўныя рэфераты і навуковыя працы, з якімі выступаюць на семінарах і навуковых канферэнцыях.

Фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі будучых настаўнікаў, іх нацыянальна-патрыятычных перакананняў, бачыцца калектывам кафедры як важнейшая задача ў сістэме шматграннай выхаваўчай работы. Менавіта таму курс айчыннай і сусветнай гісторыі пабудаваны і скіраваны на працу выкладчыкаў на выхаваўчую ідэю. У гэтым сэнсе важна падкрэсліць, што ўжо з першых сустрэч струдэнтам прапануецца азнаямленне з арыгінальнымі крыніцамі: летапісамі, дакументамі, найбольш значнымі гістарычнымі актамі, архіўнымі крыніцамі, а таксама багатым шляхам, пройдзеным калектывам нашага ўніверсітэта. Становіцца традыцыйным, калі заняткі па курсу «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый» пачынаецца з лекцыі, якая знаёміць першакурснікаў з гісторыяй універсітэта, праводзіцца экскурсія ў музей гісторыі БДПУ. Такая праца дазваляе першакурсніку ўсвядоміць што ён апынуўся ў адной са старэйшых навучальных устаноў краіны, якая мае багатыя традыцыі, ганарыцца імі.

Вядома, што выхаванне будучых настаўнікаў немагчыма без азнаямлення з культурнай спадчынай дзяржавы. Таму стала традыцыяй правядзенне выкладчыкамі кафедры семінарскіх заняткаў па адпаведных тэмах курса ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На кафедры створаны належныя ўмовы для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. Маецца добра аформлены кабінет з бібліятэчкай падручнікаў, метадычных



распрацовак наглядных дапаможнікаў. Для правядзення індывідуальных і групавых кансультацый студэнтаў па вывучаемаму матэрыялу, дапамозе ў падрыхтоўцы рэфератаў, дакладаў, кантрольных прац налажана дзяжурства выкладчыкаў.

Вялікую працу па стварэнню неабходных умоў арганізацыі самастойнай працы студэнтаў ажыццяўляе вучэбна-дапаможны персанал кафедры: вядучы лабарант В.А. Норык, лабаранты Н.Д. Ветрава, Т.І. Салаўёва. Да пачатку кожнага навучальнага года яны арганізуюць выставы рэфератаў, лепшых кантрольных прац, абнаўляюць картатэку літаратуры і публікацый па вучэбнаму курсу, друкуюць неабходныя вучэбна-метадычныя матэрыялы, ажыццяўляюць арганізацыйную работу ў перыяд правядзення конкурсаў студэнскіх прац і навукова-тэарэтычных канферэнцый, праводзяць кансультацыі для студэнтаў. Комплекс разнастойных і мэтанакіраваных форм вучэбнай работы станоўча ўплывае набыццю студэнтамі трывалых ведаў. На курсавых экзаменах за 2001–2002 навучальны год 75,5% студэнтаў стацыянара атрымалі выдатныя і добрая адзнакі *(Табліца 11)*.

*Табліца 11*

| Факультэт | Форма навучання | Колькасць студэнтаў | Выдатна | Добра | Здавальняючы | Нездавальняючы |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Фізічны | дзённае | 107 | 33 | 52 | 22 | – |
| Матэматычны | дзённае | 99 | 43 | 39 | 17 | – |
| Рускай філалогіі | дзённае | 106 | 22 | 67 | 17 | – |
| Беларускай філалогіі | дзённае<br>завочнае | 1969<br>4 | 5431 | 9136 | 5027 | 1<br>– |
| Сацыяльнай педагогікі і практычнай псіхалогіі | дзённае<br>завочнае | 148<br>70 | 86<br>23 | 44<br>29 | 18<br>18 | –<br>– |
| Прыродазнаўства | дзённае<br>завочнае | 114<br>52 | 49<br>20 | 46<br>22 | 19<br>10 | –<br>– |
| Дашкольны | дзённае<br>завочнае | 121<br>62 | 43<br>26 | 60<br>25 | 18<br>10 | –<br>– |
| Народнай культуры | дзённае<br>завочнае | 113<br>150 | 50<br>37 | 34<br>54 | 29<br>55 | –<br>4 |
| Музычна-педагагічны | дзённае<br>завочнае | 97<br>111 | 35<br>16 | 53<br>44 | 6<br>48 | 3<br>3 |
| Пачатковыя класы | дзённае<br>завочнае | 107<br>178 | 50<br>72 | 38<br>68 | 18<br>38 | 1<br>– |
| Дэфекталогіі | дзённае<br>завочнае | 159<br>108 | 145<br>37 | 5<br>28 | 9<br>43 | –<br>– |
| Псіхалогіі | вячэрняя | 49 | 23 | 26 | – | – |
| Усяго<br>Усяго ў % | | 2 240<br>100% | 895<br>40,0% | 861<br>38,5% | 472<br>21,0% | 12<br>0,5% |

У канцы 2001 г. праходзіла атэстацыя ўніверсітэта. Праверкай ведаў па курсу гісторыі Беларусі было ахоплена 903 студэнты 8 факультэтаў другога, трэцяга і чацвёртага курсаў. Выкананне кантрольных прац паказала, што агульная большасць студэнтаў паспяхова справілася з заданнямі і атрымалі высокія адзнакі *(Табліца 12)*.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Табліца 12*

**Вынікі правядзення атэстацыі студэнтаў па курсу гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый**

| Факультэт | Колькасць студэнтаў | Выдатна | Добра | Здавальняючы | Нездавальняючы |
|---|---|---|---|---|---|
| Матэматычны | 93 | 66 | 27 | – | – |
| Дашкольнага выхавання | 157 | 46 | 90 | 21 | |
| Народнай культуры | 114 | 35 | 55 | 23 | 1 |
| Рускай філалогіі | 68 | 22 | 31 | 12 | 3 |
| Сацыяльнай педагогікі і практычнай псіхалогіі | 136 | 42 | 67 | 27 | – |
| Фізічны | 37 | 15 | 20 | 2 | – |
| Пачатковых класаў | 57 | 20 | 28 | 9 | – |
| Прыродазнаўства | 241 | 71 | 131 | 36 | 3 |
| Усяго | 903 | 317 | 449 | 130 | 7 |

У мэтах навуковага і метадалагічнага ўдасканалення вучэбнага працэсу на кафедры працуе метадалагічны семінар па праблемах айчыннай гісторыі. Напрыклад, у 1999–2001 гг. на кафедры былі заслуханы і абмеркаваны даклады дактароў гістарычных навук, прафесараў У.В. Ладысева «Праблема станаўлення беларускай дзяржаўнасці», У.І. Лемяшонка «Выкарыстанне матэрыялаў кніг "Памяць" у вучэбна-выхаваўчым працэсе», дырэктара Інстытута Напалеона ў Парыжы Фернанда Бакура «Новыя дакументальныя крыніцы аб удзеле французскіх войск у баях на Беларусі ў 1812 г.».

На кафедры маецца план 5-гадовай перападрыхтоўкі выкладчыкаў і вучэбна-дапаможнага складу. Кожны выкладчык і лабарант праходзіць стажыроўку ў ВНУ г. Мінска, альбо перападрыхтоўку без адрыву ад вытворчасці ў Рэспубліканскім інстытуце павышэння кваліфікацыі вышэйшай школы пры ВДУ, а таксама за межамі Беларусі. У ЗША праходзілі стажыроўку дацэнт С.Дз. Жмуроўскі, старэйшы выкладчык А.Ф. Вялікі, у Венгрыі аспірантка В.В. Баранава.

Плённая вучэбная работа немагчыма без штодзённай навукова-даследчай працы выкладчыкаў. Неабходна адзначыць, што навуковыя даследаванні тэматычна пашырыліся, адрозніваюцца значнай грунтоўнасцю. Калі да 90-ых гадоў асноўным напрамкам распрацоўкі з'яўляліся пытанні дзейнасці Кампартыі Беларусі, то ў сучасны момант асэнсоўваюцца праблемы грамадзянскай гісторыі Беларусі.

Станоўчым з'яўляецца тое, што навуковыя індывідуальныя даследаванні набліжаны да тэм, якія разглядаюцца ў гэтым курсе. Кожны выкладчы распрацоўвае адпаведную праблему ў межах агульнакафедральнай тэмы «Беларусь у сусветным гістарычным працэсе». Значная частка навукоўцаў кафедры ўдзельнічае ў міжвузаўскім навуковым праекце «Месца моладзі ў сацыяльна-палітычнай структуры грамадства пераходнага тыпу і яе роля ў дынаміцы трансфармацыйных працэсаў» і выконваюць раздзел «Дзяржаўная стратэгія і рэгіянальная маладзёжная палітыка Рэспублікі Беларусь» (навуковы кіраўнік А.А. Каваленя), якая фінансуецца з дзяржбюджэту, а таксама ў Дзяржаўнай праграме фундаментальных даследаванняў «Даследаванне гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскіх цывілізацый» – раздзел «Беларусь у



сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах ХХ ст.» – тэма «Моладзь у сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі ХХ ст.», з 2002 г. пад навуковым кіраўніцтвам прафесара У.Ф. Ладысева, сумесна з творчым калектывам БДУ і кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі вядзецца распрацоўка навуковага праекта «Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці».

За апошнія пяць гадоў выкладчыкі кафедры прынялі ўдзел у 70 міжнародных, рэспубліканскіх навукова-тэарэтычных канферэнцыях, кангрэсах і сімпозіўмах, дзе выступалі з цікавымі навуковымі паведамленнямі. Так, на навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Грамадазнаўства ў сістэме сучаснай вышэйшай адукацыі: новыя канцэпцыі, падыходы і тэорыі і метадалогіі выкладання» (Мн., 1999).

Дацэнт В.І. Талкачоў раскрыў сучасную канцэпцыю выкладання грамадазнаўчых дысцыплін у педагагічнай навучальнай установе, прафесар А.А. Каваленя ўзняў адну з актуальных праблем – фарміравання грамадзянскай пазіцыі настаўніка ХХІ стагоддзя, дацэнт Л.А. Шульга раскрыла выхаваўчы патэнцыял гістарычных ведаў, дацэнт В.І. Касовіч абгрунтаваў важнасць рэфератыўных прац пры вывучэнні курса «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый», дацэнт Г.В. Жылінскі удакладніў новыя падыходы да ўжывання назвы «Кіеўская Русь», дацэнт С.Дз. Жмуроўскі раскрыў праблему ўзаемасувязі грамадазнаўчых дысцыплін.

Члены кафедры прынялі актыўны ўдзел у І і ІІ Міжнародных кангрэсах «Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя», на якіх выступілі з цікавымі дакладамі па пытаннях дзяржаўнасці беларусаў, іх матэрыяльнай культуры, адукацыі насельніцтва Беларусі. У другой палове 90-х гадоў кафедра выступіла арганізатарам 5 міжнародных і рэспубліканскіх навукова-тэарэтычных канферэнцый: «55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы» (4–5 мая 2000 г.), «Трагічнае лета 1941: напамін гісторыі» (22 чэрвеня 2001 г.).

Усяго за 1995–2002 гады выкладчыкамі кафедры апублікавана 6 манаграфій, 9 вучэбных дапаможнікаў, 5 вучэбных праграм, 115 навуковых артыкулаў агульным аб'ёмам звыш 200 друкаваных аркушаў.

Дацэнты В.Ф. Касовіч, В.І. Талкачоў, С.У. Кабяк, С.Дз. Жмуроўскі, В.В. Даніловіч працуюць над тэмамі доктарскіх дысертацый.

Кафедра выступіла арганізатарам І і ІІ Рэспубліканскіх конкурсаў студэнцкіх навуковых прац «Беларусь у ХХІ стагоддзі». Пад кіраўніцтвам дацэнтаў В.Ф. Касовіча, Г.В. Жылінскага, С.І. Альшэўскай, работы студэнтак спецыяльнага факультэта, матэматычнага і дашкольнага выхавання А. Янушка, В. Аляксейчык, А. Альшэўскай, Р. Чаропка занялі прызавыя месцы і адзначаны дыпломамі. Да ўдзелу ў конкурсе было прадстаўлена звыш 90 студэнцкіх работ, кіраўніцтва якімі ажыццяўлялі выкладчыкі кафедры.

Калектыў ганарыцца сваімі выхаванцамі, якія працуюць у многіх навучальных установах Рэспублікі Беларусь і за яе межамі. Так, В.Ф. Кушнер з'яўляецца галоўным рэдактарам Беларускага гістарычнага часопіса, А.М. Літвін узначальвае аддзел ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, прарэктарам універсітэта па вучэбна-выхаваўчай і сацыяльнай рабоце працуе С.У. Кабяк, прарэктарам па вучэбнай рабоце і замежных сувязях БДПУ В.І. Талкачоў, намеснікамі дэкана гістарычнага факультэта з'яўляюцца А.А. Цобкала, Дз.У. Дубінін, намеснікам дэкана музычна-педагагічнага факультэта А.К. Лабанок, загадчыкам кафедры славянскай гісторыі Брэсцкага ўніверсітэта У.В. Здановіч, дацэнтам кафедры БДУ К.І. Казак, прафесарам кафедры гісторыі Беларусі БДПУ М.К. Сакалоў, дэканам Гродзенскага абласнога Інстытута павышэння кваліфікацыі М. Еўдакіменка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ